# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ: ЗМЕНЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАРАДЫГМЫ

Репозиторий БрГУ

Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ: ЗМЕНЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАРАДЫГМЫ

Зборнік навуковых прац

Репозиторий БрГУ

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2017

УДК 355.233.2
ББК 74.9
Г 94

*Рэцэнзенты:*

прафесар кафедры паліталогіі і сацыялогіі УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна", доктар палітычных навук
**А.І. Лысюк**

прафесар кафедры фізічнай культуры і спорту УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт", кандыдат педагагічных навук
**У.М. Кудрыцкі**

*Рэдакцыйная калегія:*

У.П. Люкевіч (старшыня), К.І. Белы, П. Мазур, І.І. Лосева, С. Нікіцін

Репозиторий БрГУ

Г 94 **Гульні** і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: змены сацыяльнай парадыгмы : зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: У. П. Люкевіч (старш.) [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2017. – 195 с.
ISBN 978-985-555-576-7.

У прадстаўленых артыкулах даследчыкаў з вышэйшых навучальных установаў Беларусі, Польшчы і Украіны разглядаюцца тэарэтычныя і практычныя праблемы культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі. Матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў працэсе выкладання гуманітарных дысцыплінаў, фарміравання здаровага ладу жыцця, а таксама ў іншых формах працы па выхаванні дзяцей і моладзі.

Выданне адрасуецца студэнтам, магістрантам, выкладчыкам вышэйшай школы, а таксама работнікам сферы спорту і турызму.

**УДК 355.233.2**
**ББК 74.9**

**ISBN 978-985-555-576-7**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна», 2017

УДК 796.032.2-057.177.1

**У.П. ЛЮКЕВІЧ**
Беларусь, Брэст, УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

## ПРЭЗІДЭНТЫ МАК. П’ЕР ДЭ КУБЕРТЭН: АЛІМПІЙСКАЯ ІДЭЯ

*Уводзіны.* Імя французскага спартыўнага і грамадскага дзеяча, філосафа і педагога, заснавальніка сучаснага алімпійскага руху барона П’ера дэ Кубертэна не патрабуе дадатковых прадстаўленняў і рэкамендацыяў. Менавіта ён у 1887 годзе ініцыяваў стварэнне Саюза французскіх таварыстваў бегу – пазней Саюза французскіх таварыстваў атлетычных відаў спорту – і Камітэта па прапагандзе фізічнага выхавання. Ягоныя рэфарматарскія погляды на сістэму адукацыі затым знайшлі ўвасабленне ў дзвюх кнігах пад назвамі “Выхаванне ў Англіі” і “Англійскае выхаванне ў Францыі”, што пабачылі свет напрыканцы 80-х гадоў XIX стагоддзя.

П’ер дэ Кубертэн вызначыўся нязвыклым арганізатарскім талентам у справе адраджэння старажытных Алімпійскіх гульняў. Ён змог прыцягнуць на свой бок шматлікіх еўрапейскіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, набыў прыхільнікаў і паслядоўнікаў у розных краінах. Таму, калі 16–23 чэрвеня 1894 года ў парыжскай Сарбоне на знакамітым Міжнародным атлетычным кангрэсе было прынята гістарычнае рашэнне пра адраджэнне Алімпійскіх гульняў, роля Кубертэна ў гэтым працэсе была вызначальнай і вырашальнай. Ад 1896 года па 1925 год ён узначальвае Міжнародны алімпійскі камітэт і, такім чынам, становіцца другім пасля Дземетрыюса Вікеласа прэзідэнтам МАК.

Трэба адзначыць, што творчы ўнёсак П. дэ Кубертэна ў станаўленне, развіццё, функцыянаванне і распаўсюджванне алімпізму знайшоў свой адбітак у шмат якіх далейшых сацыяльных працэсах. А сам ён асабіста вызначыўся падчас літаратурнага конкурсу, які ўпершыню быў уключаны ў праграму V Алімпіяды 1912 года ў Стакгольме, калі атрымаў залаты медаль за сваю “Оду спорту” (твор быў падпісаны псеўданімам і толькі на цырымоніі ўзнагароджвання высветлілася, хто сапраўды з’яўляецца аўтарам). П’ер дэ Кубертэн таксама звяртаў вялікую ўвагу на філасофскае асэнсаванне алімпізму, і ў прыватнасці алімпійскай ідэі. МАК нават усталяваў медаль П’ера дэ Кубертэна за праявы высакародства і вернасці духу “Fair play” падчас Алімпійскіх гульняў.

Алімпіяды сучаснасці, зразумела, вельмі моцна адрозніваюцца ад тых спаборніцтваў, якія праходзілі напрыканцы XIX стагоддзя.

Рэпазіторый БрДУ

Яны адрозніваюцца не толькі па форме правядзення, але і па тым змесце, што складае іх унутраную сутнасць. Паняцце адной з самых старажытных глабальных ідэяў чалавецтва – ідэі алімпізму – пэўным чынам трансфармавалася на працягу XX стагоддзя, а ў нашыя дні перажывае адпаведную мадэрнізацыю. Зараз можна дыскутаваць адносна праблемы развіцця алімпізму адразу ў некалькі накірунках, у тым ліку і наконт ягонага крызісу, але таксама немалаважна прасачыць некаторыя суадносіны трансфармацыі алімпійскай ідэі ад часоў кубертэнаўскага рэнесансу да рэаліяў сённяшняга дня.

*Асноўная частка.* Алімпійская ідэя, якая фарміравалася на тэрыторыі Старажытнай Грэцыі, у самым агульным выглядзе можа быць прадстаўлена як структура з трох элементаў, г.зн. ідэя аб гарманічным развіцці чалавечай асобы; ідэя свяшчэннага міру; ідэя fair play.

П'ер дэ Кубертэн у сваім выдатным творы "Ода спорту" падкрэсліў імкненне да гармоніі ў спалучэнні ў чалавеку фізічных і духоўных якасцяў:

О спорт! Ты – зодчий!

Ты помогаешь находить пропорции совершеннейшего творения природы – человека, торжествующего в победе и сокрушающегося в неудаче.

Ты – мастер гармонии.

Ты делаешь нас сильными, ловкими, статными, исправляешь недостатки, унаследованные нами от рождения.

Ты особенный, необычный зодчий. Твой строительный материал – человек в движении.

Ты доказал, что вечное движение – не мечта, не утопия. Оно существует.

Вечное движение – это спорт [4, с. 179–180].

У больш шырокай інтэрпрэтацыі алімпійская ідэя, як яе сабе ўяўляў П'ер дэ Кубертэн, увасабляла развіццё міжнароднага спартыўнага руху на падставе гуманістычных традыцыяў, пераадоленне разнастайных сацыяльных супярэчнасцяў, фарміраванне ўнутранай эстэтычнай і этычнай сутнасці спорту, развіццё таварыскіх спартыўных кантактаў паміж народамі, аматарства ў спорце, а таксама спалучэнне міжнароднага спартыўнага руху з прагрэсіўнымі сіламі чалавецтва. Такі падыход у пэўным сэнсе базаваўся на прынцыпах спартыўнай этыкі, і сам спорт вызначаўся не толькі як сродак фізічнага развіцця чалавечага цела, ён выступаў у той самы час у якасці метаду выхавання сучаснага чалавека ў духу скіраванасці да мірнага ўзаемадзеяння.

Прафесар Юзэф Ліпец у сваёй кнізе "Філасофія алімпізму" адносна паняцця "алімпійская ідэя" падкрэслівае, што напісана пра яе настолькі шмат, што кожная новая спроба нейкага іншага яе прачытання з непазбежнасцю вядзе да банальнага паўтарэння. Разам з тым існуе

Репозиторий БрГУ

магчымасць дыялектычнага суаднясення ў гістарычным успрыманні па меншай меры дзвюх пар узаемазвязаных велічынь. Першую ўтвараюць класічны старажытнагрэцкі алімпізм, насычаны духам рэлігійнай і філасофскай калакагатыі, і таксама сінкрэтычны і касмапалітычны алімпізм, характэрны для эпохі элінізму і рымскага імперыялізму. Другая пара складаецца з рамантычнага і аматарскага алімпізму эпохі Кубертэна і прагматычнага, прафесійнага, гіганцкага, камерцыйнага, медыяльнага, узброенага сродкамі аўтаномнай універсальнасці алімпізму эры Самаранча [7, с. 129]. Ю. Ліпец вельмі ўдала падкрэсліў унутраную сутнасць разумення алімпійскай ідэі праз П. дэ Кубертэна на падставе рамантызму і аматарства [5, с. 128–131], што дазваляла падвесці гэты феномен пад акрэсленасць яго з боку эстэтычных і этычных складнікаў, такіх, напрыклад, як прыгажосць, справядлівасць, высакародства і інш.

Паняцце алімпійскай ідэі непарыўна звязана з яшчэ адным старажытнагрэцкім вынаходніцтвам – свяшчэнным мірам. За чатыры тыдні да пачатку Алімпійскіх гульняў, на час іх правядзення і на чатыры тыдні па заканчэнні Алімпіядаў павінны былі перапыніцца ўсе войны на тэрыторыі Элады. Гэтае палажэнне таксама знайшло свой адбітак у кубертэнаўскім падыходзе:

О спорт! Ты – мир!

Ты устанавливаешь хорошие, добрые, дружественные отношения между народами.

Ты – согласие.

Ты сближаешь людей, жаждущих единства.

Ты учишь разноязыкую, разноплеменную молодёжь уважать друг друга.

Ты источник благородного, мирного, дружеского соревнования.

Ты собираешь молодость – наше будущее, нашу надежду – под свои мирные знамёна.

О спорт!

Ты – мир! [4, с. 182].

Чалавецтва ад пачатку свайго існавання заўсёды пакутавала ад войнаў. Спорт у сучасную эпоху стаў выконваць кампенсаторную функцыю, якая павінна была б спрыяць перанясенню вырашэнняў сацыяльных канфліктаў у іншую сферу. Спробы спыніць войны з дапамогай спорту рабіліся неаднойчы. Так, напярэдадні зімовых Алімпійскіх гульняў 1984 года ў Сараеве тагачасны прэзідэнт МАК маркіз Хуан Антоніа Самаранч заклікаў перапыніць усе баявыя дзеянні на час правядзення гульняў. На жаль, заклікі не заўсёды прымаліся да ведама.

Яшчэ адным элементам спадчыны старажытнагрэцкай даўніны з'яўляецца "arete". Гэты тэрмін, які ў самым агульным сэнсе можа быць

Репозиторий БрГУ

трактаваны як адвага, гонар, мужнасць, мае самыя непасрэдныя адносіны да сфарміраваных да сённяшняга дня прынцыпаў Fair play. Менавіта так можа разглядацца першы падыход да ўтварэння сучаснага разумення fair play. Другі палягае на тым, што паўстае формула шляхетных паводзінаў, у тым ліку і на спаборніцтвах, у фарміраванні якой вялікае значэнне належала ўплыву культуры хрысціянскага Сярэднявечча, асабліва рыцарскай культуры з яе духам чыстага, без падману, з роўнасцю шанцаў адзінаборства. Нарэшце, згодна з трэцім падыходам, мяркуецца, што прынцыпы Fair play спачатку ўзнікаюць у спорце, а затым ужо пачынаюць распаўсюджвацца на іншыя сферы жыцця [2, с. 63–67].

П'ер дэ Кубертэн з уласцівым яму імпэтам вызначае наступным чынам гэты аспект алімпійскай ідэі:

О спорт! Ты – благородство!

Ты осеняешь лаврами лишь того, кто боролся за победу честно, открыто, бескорыстно.

Ты – безупречен.

Ты требуешь высокой нравственности, справедливости, моральной чистоты, неподкупности.

Ты провозглашаешь: если кто-нибудь достигнет цели, введя в заблуждение своих товарищей, достигнет славы при помощи низких, бесчестных приёмов, подавив в себе чувство стыда, тот заслуживает позорного эпитета, который станет неразлучен с его именем.

Ты возводишь стадионы – театры без занавесей. Все свидетели всему.

Никакой закулисной борьбы.

Ты начертал на своих скрижалях: “Трижды сладостна победа, одержанная в честной благородной борьбе” [4, с. 180–181].

Пазней, у 90-я гады XX стагоддзя, быў распрацаваны шэраг дакументаў, якія ўдакладнялі і канкрэтызавалі падставовыя палажэнні маральных аспектаў спорту. Адной з такіх крыніцаў з'яўляецца Спартыўны этычны кодэкс “Fair play – шлях да перамогі”. У ім найперш утрымліваюцца палажэнні, якія накіраваныя ў бок дзяцей і моладзі, а таксама маюць дачыненні да тых сацыяльных інстытутаў і фізічных асобаў, што працуюць з вызначанай сацыяльнай групай [1, с. 77–83].

Глыбіня кубертэнаўскай думкі ў распрацоўцы алімпійскай ідэі сягала да інтэрпрэтацыі сутнасці паняцця спартыўнай дзейнасці. Апошняя прызнавалася выключна як непрафесійная, і таму найважнейшым вынікам яе было атрыманне самім атлетам пачуцця задавальнення, перш за ўсё маральнага і эстэтычнага. Згодна з такім падыходам П. дэ Кубертэн адмоўна ставіўся да баксёрскіх двубояў за грошы, размяжоўваў працу настаўніка фізічнага выхавання і прафесійнага адмыслоўца (першы павінен быць аматарам), а таксама быў супраць усялякіх публічных спаборніцтваў

Рэпазіторый БрДУ

для юніёраў ва ўзросце да 16 гадоў [6, с. 132]. Таму няма ніякай нечаканасці ў тым, як заснавальнік сучасных Алімпіядаў трактаваў адносіны спартоўца да гэтага віду дзейнасці: галоўнае не перамога, а ўдзел, хоць з гістарычных крыніцаў вядома, што ў Старажытнай Грэцыі падчас правядзення Алімпійскіх, Нямейскіх, Піфійскіх, Істмійскіх і іншых гульняў існавалі грашовыя ўзнагароды для пераможцаў: ад 500 драхмаў на Алімпійскіх гульнях, да 100 драхмаў – на Істмійскіх [3, с. 3–7].

Праз нейкі перыяд уяўленне пра сутнасць спорту пачне пакрыху мяняцца. Пад уплывам дамініканіна Анры Дзідона, дырэктара адной са школаў у ваколіцах Парыжа, нарадзіўся славуты дэвіз “Altius. Fortius. Citius.” А ўрэшце і сам П. дэ Кубертэн практычна паказвае шлях да прафесіяналізацыі спорту. У адным са сваіх тэкстаў, які пазней быў перакладзены на розныя мовы, ён сфармуляваў закон, што выглядае наступным чынам: на сто асобаў, якія прысвячаюць сябе фізічнай культуры, пяцьдзясят павінна займацца спортам; каб гэтыя пяцьдзясят займаліся спортам, дваццаць павінны ў ім спецыялізавацца; каб дваццаць спецыялізавалася, пяцёра павінны быць здольнымі ў дасягненні дзівосных вынікаў [6, с. 134]. Прайшло адносна няшмат часу, і пяцёра здольных у дасягненні дзівосных вынікаў ператвараюцца ў прафесіяналаў. Рамантычная і поўная сантыментаў эра П’ера дэ Кубертэна практычна завяршылася.

*Высновы.* Адраджэнне алімпійскай ідэі і аднаўленне традыцыі правядзення Алімпійскіх гульняў у найноўшай гісторыі сталася магчымым дзякуючы шматлікім асабістым талентам П. дэ Кубертэна. Ягоная інтэрпрэтацыя спадчыны культуры Старажытнай Грэцыі адносна феномену алімпізму спрыяла фарміраванню, развіццю, функцыянаванню і распаўсюджванню спорту па ўсім свеце і, між іншым, пакінула магчымасці для больш шырокай трактоўкі гэтай з’явы згодна са зменамі сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства на падставе тэндэнцыі глабалізацыі.

Аўтар звяртаецца да сацыяльна-філасофскай спадчыны заснавальніка сучасных Алімпійскіх гульняў барона П’ера дэ Кубертэна ў адносінах да разумення і інтэрпрэтацыі алімпійскай ідэі. Гэтае паняцце, якое ўзнікла ў культуры Старажытнай Грэцыі, атрымала новыя імпульсы да развіцця ў варунках глабалізаванага грамадства нашых дзён. Але, як паказвае практыка спартыўных спаборніцтваў, рамантычная і сентыментальная сутнасць спорту падпадае пад усё больш ціск бязлітасных камерцыялізацыйных працэсаў.

The author addresses social philosophically heritage of the founder of the modern Olympic Games baron Pierre de Coubertin concerning understanding and interpretation of the Olympic idea. This concept which has arisen in culture of Ancient Greece has received new impulses of development in the conditions of the globalized society of our days. However as practice of sports competitions shows the romantic and sentimental essence of sport gets under the increasing pressure of ruthless processes of commercialization.

Рэпазіторый БрДУ

1. Люкевіч, У. Fair play: тэорыя і практыка / У. Люкевіч. – Берасьце : Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – 188 с.
2. Люкевіч, У. Спартыўная этыка : навуч. дапам. для студэнтаў фак. фіз. выхавання / У. Люкевіч. – Брэст : Б. в., 2007. – 120 с.
3. Люкевіч, У. П. Гульні Старажытнай Элады / У. П. Люкевіч // Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: традыцыі і навацыі : зб. навук. прац. – Брэст : Альтернатива, 2014. – С. 3–7.
4. Кубертен де, П. Ода спорту / П. де Кубертен // Олимпийский огонь: Спорт в творчестве поэтов мира : сборник / сост. В. П. Бурич. – М. : Физкультура и спорт, 1980. – С. 179–182.
5. Люкевич, У. Романтизм и сентиментализм fair play в прагматическом обществе / У. Люкевич // Международные спортивные юношеские игры стран СНГ, Балтии и регионов России под патронажем Международного олимпийского комитета. II Международный форум “Молодежь – Наука – Олимпизм”. XI Конференция “Олимпийское движение и социальные процессы” : материалы. – М. : Совет. спорт, 2002. – 304 с.
6. Coubertin de, P. Przemówienia. Pisma różne i listy. T. II / P. de Coubertin. – Warszawa : LEA Sp.z o.o., 1994. – 152 s.
7. Lipiec, J. Filozofia olimpizmu / J. Lipiec. – Warszawa : SPRINT, 1999. – 234 s.

УДК 1372.41-053.81

**А. АНТАС-ЯЩУК**
Польша, Седльце, Естественно-гуманитарный университет

## СВОБОДНОЕ ВРЕМЯ МОЛОДЕЖИ – НОВЫЙ ВЫЗОВ ДЛЯ ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ АКТИВНОСТИ РОДИТЕЛЕЙ

Существует много определений свободного времени. Свободное время – составная часть обыденной культуры. Издавна празднование, связанное с играми и отдыхом, ассоциировалось со временем, свободным от работы, и доныне эти действия остаются синонимами досугового поведения [6, с. 62]. Свободное время, досуг появляются в поле исследовательского интереса во второй половине XIX века. В качестве общедоступного явления досуг появился в междувоенном периоде в связи с введением 8–9-часового рабочего дня и оплачиваемых отпусков [2, с. 27]. Термин «свободное время» распространился особенно после признания его Международной конференцией ЮНЕСКО в 1957 году [5, с. 559].

Репозиторий БрГУ